# РАМАН ІВАНА ШАМЯКІНА «ЗЛАЯ ЗОРКА»: ПРАБЛЕМАТЫКА, СІСТЭМА ВОБРАЗАЎ

***А. А. Ігнатовіч***

**БДПУ (Мінск)**

***Навук. кіраўн. – Т. М. Тарасава, д-р філалаг. навук, праф.***

**Анатацыя.** Разглядаецца ідэйна-сэнсавы змест рамана «Злая зорка» І. Шамякіна. Характарызуецца сістэма вобразаў твора.

Ключавыя словы: І. Шамякін; мастацкі вобраз; экалагічная праблема; чарнобыльская тэма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Амаль не распрацаваным пытаннем у беларускай літаратуры з'яўляецца пытанне мастацкага вобраза. Прычына таго – сам мастацкі вобраз, які выяўляе ўласную аўтарскую канцэпцыю. Мастацкі вобраз – адна з асноўных і найбольш складаных катэгорый мастацтва. Менавіта мастацкая вобразнасць адрознівае мастацтва ад іншых форм адлюстравання і пазнання рэчаіснасці. У кожнага аўтара свае мастацкія вобразы. Аднак вобраз лічыцца не проста самавыражэннем аўтара, а яшчэ і па-мастацку ўзноўленай карцінай рэальнага жыцця. ***Мастацкі вобраз у літаратуры*** – гэта форма пазнання і адлюстравання жыцця. Гэта метафарычная думка, якая раскрывае адну з'яву праз іншую. Вобраз перадае рэальнасць і ў той жа час стварае новы выдуманы свет, які ўспрымаецца намі як той, што існуе на самой справе.

Усе мастацкія вобразы аб'ядноўваюцца ў сістэму. Сістэма, як адзначана ў «Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы», – гэта спалучэнне заканамерна звязаных паміж сабой элементаў (прадметаў, з'яў, ведаў і пад.), якія складаюць нешта цэласнае, адзінае [2, с. 599]. Паняцце сістэмы часам можна атаясамліваць з паняццем структуры. (Структура – гэта ўзаемаразмяшчэнне і сувязь састаўных частак аб'екта, якія забяспечваюць яго цэласнасць; будова [2, с. 631].)

***Сістэма літаратурных вобразаў*** – сукупнасць літаратурных герояў у мастацкім творы, іх узаемаадносіны паміж сабой, а таксама іх роля ў сюжэце твора і ў раскрыцці аўтарскай задумы. Яна адыгрывае важную ролю ў адлюстраванні тэмы і ідэі твора.

У рамане «Злая зорка» І. Шамякіна створана сістэма яркіх і запамінальных вобразаў, якая дазваляе спасцігнуць ідэйна-сэнсавы змест твора, прысвечанага чарнобыльскай трагедыі. 26 красавіка 1986 года – дзень, які назаўсёды застанецца ў памяці жыхароў Беларусі, Украіны, Расіі і іншых краін. Менавіта ў гэты дзень адбылася найбуйнейшая тэхнагенная катастрофа – аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. У выніку гэтага ў паветра трапіла вялікая колькасць радыёактыўных рэчываў, што нанесла вялікую шкоду не толькі людзям, якія жылі на гэтай тэрыторыі, але і прыродзе.

У 1991 годзе І. Шамякін напісаў першы ў гісторыі беларускай літаратуры раман на тэму чарнобыльскай катастрофы – «Злая зорка». Твор насычаны вялікай колькасцю мастацкіх вобразаў.

Самым моцным у рамане з'яўляецца вобраз ***Уладзіміра Паўлавіча Пыльчанкі***. Менавіта на яго, старшыню райвыканкама, абрушыўся цяжар трагедыі. Сам па сабе Уладзімір Паўлавіч быў клапатлівым бацькам і добрым сем'янінам. Па характары, які так значна адрозніваўся ад характару Вольгі Андрэеўны, яго жонкі, мужчына быў спакойны, многія рэчы ён успрымаў з іроніяй, якая была ў нейкім сэнсе яго «разыначкай». Аўтар паказвае Уладзіміра Паўлавіча працавітым чалавекам: «*Звычайны свой ранні працоўны дзень пачынаў з таго, што з галавой акунаўся ў клопаты – званіў у вобласць, у калгасы, выклікоў загадчыкаў аддзелаў кіраўнікоў прадпрыемстваў, службаў. З некаторымі ён жартаваў, іншых уедліва прабіраў – раённых чыноўнікаў, асабліва ў сферы жыццезабеспячэння*» [2, с. 6]. Вобраз Пыльчанкі – вобраз мудрага і неабыякавага да людзей кіраўніка. Ён нават у крытычнай сітуацыі адчувае адказнасць за іх. Менавіта Уладзімір Паўлавіч кіраваў перасяленнем людзей з атручанай тэрыторыі, яшчэ не ведаючы, наколькі страшная трагедыя напаткала іх. Ён глыбока перажывае бяду сваёй роднай зямлі, бачыць сумныя вынікі чалавечай бяздумнасці і бяздушнасці.

Вобраз ***Вольгі Андрэеўны*** стаў адлюстраваннем характару жанчыны з абвостраным пачуццём мацярынства, якая стойка перажывае з мужам усе цяжкасці становішча. Адрозненні характараў Уладзіміра Паўлавіча і Вольгі Андрэеўны аўтар паказвае яшчэ на самым пачатку рамана: «*Жаніўся Глеб. Маці хвалявалася. А бацька праяўляў спакой, той уласцівы яму спакой, падсолены іроніяй, які ціхмяную і сапраўды спакойную – не ў прыклад мужу – Вольгу Андрэеўну*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*абураў і злаваў*» [2, с. 5]. Нягледзячы на духоўную загартаванасць, не вытрымала жанчына, калі сярод тых бед, якія суправаджалі яе сям’ю з моманту катастрофы, яна адчула, што старэйшы сын загінуў. Сапраўды, гэты нясцерпны боль матчынага сэрца і стаў апошняй кропляй. Памерла яна ў бальніцы. Але калі хавалі жанчыну, амаль усе людзі былі ўпэўнены, што вінаватая ў яе смерці радыяцыя: «*Мноства людзей праводзілі нябожчыцу да могілак. Усе, нават тыя, хто даведаўся пра смерць Барыса, зналі пра хваробу Глеба, усё роўна лічылі, што маці – ахвяра радзіяцыі*» [2, с. 358].

З вобразам старэйшага сына Пыльчанкі – ***Барысам*** – звязана тэма вайны ў Афганістане. Самым нечаканым учынкам хлопца з’яўляецца менавіта тое, што два гады таму ён сам папрасіўся ў Афганістан. Цяжка ўявіць перажыванні маці ў той год, пакуль Барыс быў у чужой краіне. Яшчэ да таго, як ён папрасіўся ў Афганістан, хлопец вучыўся ў ваенным вучылішчы і нават дастаткова хутка асвоіўся там. Падчас вучобы ў вучылішчы Барыс крыху змяніўся: стаў больш цынічны, нярвовы. Справы раёна і палітыка хлопца ўвогуле мала цікавілі, што абурала бацьку. Барыс быў дастаткова легкадумны і зняважлівы да дзяўчат, і толькі ў адной Тамары, малодшай дачкі Пустахода, атрымалася яго нечым зачапіць. Толькі яна магла ўтаймаваць характар старэйшага сына Пыльчанкаў, бо моцна яго кахала.

Поўнай процілегласцю Барысу ў рамане выступае ***Глеб***. Ён радаваў бацькоў сваім спакоем і пастаянствам. Хлопец вучыўся некалі ў Кіеве. Глеб любіў прыроду, і гэта сведчыць аб своеасаблівай рамантычнай натуры хлопца. Некалі пасля інстытута Глеб папрасіўся працаваць у Прыпяць, каб быць бліжэй да бацькоў і сваёй каханай. Праз вобраз Глеба Пыльчанкі Шамякін паказвае чалавека, у якога душа баліць за сваю працу і за бяспеку народа. Бо толькі вельмі адказны і неабыякавы да сваёй працы і народа чалавек можа ўцячы нават са свайго вяселля, даведаўшыся пра катастрофу. Глеб ведаў, наколькі гэта небяспечна, але дапамогу энэргетыкам на станцыі лічыў сваім абавязкам.

Глеб ажаніўся з ***Ірынай***, дачкой Пустахода: «*Будучая нявестка даўно падабалася Уладзіміру Паўлавічу. І прыгажосцю сваёй. І сур’ёзнасцю – да жыцця, да навукі. Харошы ўрач расце*» [2, с. 46]. Адзіная рыса характару дзяўчыны, якая насцярожвала маці Глеба, – залішняя самаўпэўненасць. Такая дзяўчына найбольш падыходзіла мяккаму характару Глеба. Ірына таксама вельмі смелая, незалежная і моцная духам дзяўчына, умела годна трымацца ў любых абставінах. Яны з Вольгай Андрэеўнай пайшлі пешшу са сваёй вёскі да чарнобыльскай станцыі, каб паглядзець, як справы ў Глеба. У гэтым праяўляюцца ўсё жаночае каханне і любоў жонкі і маці. У час свайго «вандравання» Ірына расказала Вользе Андрэеўне пра сваю цяжарнасць. Даволі смелым і рызыкоўным учынкам было пакінуць дзіця ў такі час.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Самай недарэчнай ахвярай Чарнобыля стала старэйшая дачка старшыні калгаса – ***Ліза Пустаход***. З самага пачатку знаёмства чытачоў Ліза паўстае працавітай гаспадыняй. Сам аўтар апісвае яе наступным чынам: «*Галавой у доме, камандуючай, як жартаваў бацька, была не добрая, ласкавая гаспадыня, а старэйшая дачка, Ліза, даярка, маці траіх дзяцей, гаварункя,што, аднак, не шкодзіла ёй быць хітрым палітыкам. Мужа свайго, механіка, яна трымала пад пятой, сама так казала, і ён не пярэчыў, хоць з-пад улады, як высветлілася, выходзіў нярэдка*» [2, с. 27].

Менавіта праз вобраз Лізы аўтар паказвае, як вар’яцелі людзі ад радыяцыі. Глыбей за ўсё гэта адлюстравана ў эпізодзе, калі ўжо на новым месцы жыхарства старшыня не даў Лізе каня, каб бараніць зямлю на сваім участку. Такога жанчына ўвогуле не чакала, старшыня сваёй адмовай давёў маці трох дзяцей да нярвовага зрыву, што ў выніку скончылася трагічна: «*Ліза надзела хамут на плечы, гукнула, каб пачулі людзі: – Но-о, кабыла! – і пацягнула барану*» [2, с. 266]. Ніхто не чакаў такога ўчынку ад моцнай характарам гераіні рамана. Нават новыя суседзі спачатку проста выходзілі на вуліцу, каб паглядзець на гэты «спектакль», ніхто не спрабаваў спыніць жанчыну. Смерць гераіні ўразіла не толькі сям’ю Пустаходаў, але і ўсіх астатніх. Больш за ўсіх скаланула Уладзіміра Пыльчанку. Менавіта ён зразумеў, што Ліза «*пачала лік ахвяр ад катастрофы*» [2, с. 267], у той час як астатнія ўвогуле не бачылі сувязі паміж гэтымі падзеямі.

Такім чынам, у рамане «Злая зорка» І. Шамякін раскрыў характары людзей, якія апынуліся ў самым цэнтры катастрофы, паказаў змены псіхічнага і фізічнага стану жыхароў атручанай тэрыторыі.

## *Літаратура*


1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы ; пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – Мінск : БелЭн, 1996. – 783 с.
2. Шамякін, І. Злая зорка : раман / І. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 1993 – 366 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ